Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 38. Вільня, Нядзеля 6 Лістапада 1932 г. Год VIII (XVI)

# Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ

## Памятаймо аб народнай асьвеце!

Палажэньне беларускай народнай асьветы, як ведама, проста трагічнае. Мы так як і ня маем сваіх родных школ. Пачаткавыя школы на беларускіх землях у Польшчы бадай выключна польскія, а апошнія дзьве беларускія гімназіі так-жа нядаўна перайшлі на ўласнасьць дзяржавы і няведама, што іх чакае. Беларускія дзеці, якія ідуць у польскія школы з прымусу — бо існуе закон аб прымусовым навучаньні — вучацца там агулам слаба і ў выніку мала чаго навучаюцца. Навукай сяньня ўжо даказана, што найхутчэй і найлепш дзіця навучаецца і разьвіваецца духова, калі яго вучаць у яго роднай мове. Гэта рэч цалком натуральная — дзіця, якое змушаюць вучыцца ў чужой яму мове, каб што пазнаць і чаго навучыцца, мусіць сьпярша навучыцца тэй мовы, у якой у школе да яго прагаварваюць, а гэта, ведама, забірае дзіцяці час і замест навукі толькі муча яго. Дзеля-ж гэтага ўсе народы так натужна і часта востра змагаюцца за сваю родную бацькаўскую мову ў школе, у царкве-касьцелё. У нас, на жаль, тыя, ад каго гэта справа залежа, аб гэтым забываюцца і нашых дзяцей, як па школах, так і па сьвятынях, вучаць пачужацку.

Тымчасам народ беларускі адраджаецца і маладому свайму пакаленьню мусіць даць магчымасьць роднага навучаньня, магчымасьць беларускай народнай асьветы. Калі сяньня мы бяссільны, каб дабіцца ад польскіх уладаў беларускай народнай школы, дык мы павінны пашукаць у гэтай справе якога іншага спосабу. У вадным з папярэдніх нумароў „Бел. Крыніцы“ з дня 23.X сёл. г. у артыкуле «Нявыкарыстаная магчымасьць», мы зьвярнулі ўвагу нашага грамадзянства і народу на неабходнасьць выкарыстаньня права дамашняга, пазашкольнага навучаньня ўсяго таго, што трэбуецца польскімі школьнымі законамі і на што законы гэтыя пазваляюць. Але — пісалі мы — магчымасьць гэту, дзеля праўных фармальнасьцяў, можна было-б пачаць выкарыстываць, адпаведна да гэтага прыгатаваўшыся, да канца жніўня 1933 г., толькі ў будучым школьным годзе.

Адклад аднак, як кажуць, ня йдзе ў лад, няма чаго чакаць ды-й справа такая, аб якой мы ніколі не павінны забывацца. Не такім, то іншым спосабам, але народная беларуская асьвета павінна пашырацца ў самыя цёмныя закуткі нашага краю, вучачы граматы і агулам прасьвячаючы і малых і старых.

Вось-жа адным з такіх спосабаў народнага навучаньня, даступнага і магчымага ў кожным часе, ёсьць спосаб саманавучаньня. Гэта знача, што тыя беларусы, якія ўмеюць чытаць і пісаць парасейску, ці мо й папольску — павінны навучыцца і пабеларуску, а пасьля далей самым займацца самаасьветай і абавязкава клапаціцца аб навучаньні чытаць і пісаць пабеларуску іншых, як сваіх дзяцей, сваіх хатніх агулам і так-жа сваіх суседзяў. Даканаць гэтай так важнай справы— народнага саманавучаньня, можна — што кожнаму ясна — пры помачы беларускага лемэнтара, беларускай чытанкі, беларускай кніжкі, газэты ўрэшце. Усю гэту літэратуру дастаць можна дужа танна ў беларускай кнігарні „Пагоня“ (Wilnia, Zawalnaja 6—10).

Гэткі спосаб пашыраньня беларускай асьветы лёгкі, даступны і дазнаны; спосабам гэткім карысталіся многія народы дзеля свайго адраджэньня. Вызваленьне польскага народу з панаваньня над ім аж трох цароў у значнай меры адбылося дзякуючы саманавучаньню праз польскае друкаванае слова. Чаго не даканалі польскія збройныя паўстаньні проціў заборцаў, тое дапоўніла польская кніга.

Тое-ж самае і з народам літоўскім. Друкаванае літоўскае слова было першым і найважнейшым аружжам барацьбы літоўскага народу за сваю волю, за сваё адраджэньне. Добра зразумеў гэта і вораг гэтага адраджэньня — расейскі царскі ўрад, накідаючы літоўцам чужую гражданку і рознымі паліцэйскімі спосабамі змагаючыся з літоўскай кніжкай і газэтай, не дапускаючы іх у народ. Дзеля гэтага літоўцы друкавалі тады свае кніжкі заграніцай і адтуль, наражаючыся на штрафы, вастрог і Сібір, пераносілі іх у край і шырылі сярод народу, дзе часта літоўскія маткі, пры калаўроце прадучы кудзелю, вучылі сваіх дзетак роднай граматы, як гэта прыгожа малююць літоўскія мастакі-маляры. Пэрыяд так званых «Knygnešiu» — нашэльнікаў кніг у гісторыі літоўскага народнага адраджэньня запісаны залатымі літэрамі.

Вось-жа і мы аб пашыраньні народнай асьветы праз беларускае друкаванае слова не павінны забывацца. Мы жывём крыху ў лепшых варунках, як нашы суседзі літоўцы, — друкаваць беларускія кніжкі і пашыраць іх мы ўсё-ж-такі сякую-такую магчымасьць маем. Праўда, розныя труднасьці і перашкоды ў гэтым мы так-жа напатыкаем і напатыкаць будзем, але наша ахвота і зразуменьне справы пераможа ўсё. Дык шырэмо-ж народную беларускую асьвету праз беларускае друкаванае слова!...

## Безнадзейнасьць і вера.

Аб сучасным жыцьці матэрыяльным і духовым беларускага сялянства ў Зах. Беларусі пішуць у нашу газэту сяляне карэспандэнцыі, якія мы ў кожным нумары „Б. Крыніцы“ зьмяшчаем. Той, хто дакладна прачытвае гэтыя карэспандэнцыі і падлічвае іх у цэласьці, той мае поўную ілюстрацыю сучаснага жыцьця нашага сялянства.

Гэтымі днямі атрымала наша рэдакцыя карэспандэнцыю з Наваградчыны, у якой наш дапішчык селянін апісвае жыцьцё ў сваіх вакол цах вось так:

«Штораз то горш становіца жыць. Ні адкуль на лепшае ня выглядае. Прадукты земляробскія так танныя, што іх бяруць ад сялян на рынку чуць не дарма. Добрая карова йдзе за 50 зл., а то і таней. Кормленая сьвіна 70—80 грашоў кілёграм і то дай купцу 10 кілёграм ськідкі ад штукі. Вёска згалела зусім. Грошай сяляне ня маюць. Гаспадаркі дробныя—3—4 дзесяціны зямлі. Сем'і 6—7 асоб. Заработкаў нідзе ніякіх няма. Калі дзе падчас якая работа здарыцца, дык каб туды прынялі, трэба ўпярод запісацца ў „Стшэльцы“, або ў якое іншае „пшыспособене». Няма тае вёскі, у якой-бы не адбываліся ліцытацыі сялянскай маемасьці—то за падатак, то за даўгі ў касе Стэфчыка ці якой іншай крэдытнай установы. Купляць з ліцытацыі няма каму, хіба надарыцца ахвотнік з чынавенства на сялянскі, йшчэ таней як на рынку, прадукт.

Людзі жывуць абы дзень да вечара. Духовай пацехі так-жа няма. Усюды незразумелае, кругом чужое. Прасьветы ў роднай мове няма. У касьцеле, каб штось зразумець, трэба знаць польскую мову, бо там ўсё папольску. У царкве—усё парасейску. У гміне—так-жа польшчына.Школа для беларусаў і тая польская.

Людзі трацяць веру ў Бога і заглушаюць сумленьне. Народ дзічэе. Разбоі і зладзейства пашыраюцца.

Адзінае падтрыманьне духовае ў народзе—гэта толькі родная газэта і дзе-ня-дзе гурток культурна-прасьветнай беларускай арганізацыі. Але-ж гэтага мала. Пры гэтым ня так лёгка залажыць гурток беларускай культурна-прасьветнай арганізацыі, а яшчэ цяжэй вясьці народную беларускую асьветную працу. На дарозе гэтай працы нямала спатыкаецца перашкод. Адны зьвягаюць, што гэта камунізм, другія — што рэлігійны „індыфэрэнтызм, а іншыя кажуць — проста шкодная работа і баста. З роднай газэтай ў руках наш селянін таксама ня надта сьмела ўсюды пакажацца, бо адзін яе называе бальшавіцкай, другі—бязбожніцкай, а іншыя кажуць, што гэта газэта „выврутова“ нейкая і селяніну, калі ён хоча мець сякую-такую »пашану“ ў тых, што называць сябе „добрымі людзьмі“, чытаць яе ня можна.

У такіх вось варунках жыве цяпер нашае сялянства. У такім-жа палажэньні гадуецца і нашая моладзь — будучыня нашага народу і правапарадку ў краю.

Ужо цяпер дарослая моладзь перастае паважаць бацькоў і ўважаць старэйшых. Адхілілася яна ўжо ад Царквы і Касьцёлу. Духавенства чужое крывёй і духам уплыву на моладзь ня мае ніякага. Аўторытэт для гэтай моладзі ўжо ня існуе. У польскія арганізацыі запісваецца гэтая моладзь крывадушна, каб дзе, калі, за што не папала злавіць залатоўку, пасьля напіцца гарэлкі, а напіўшыся да п'яна, пабуяніць на сабраньні. Калі не ўдаецца гэтакім спосабам, г. зн. у „Стшэльцы,» або ў іншай якой польскай арганізацыі злавіць час ад часу на гэтыя „патрэбы“ нашай моладзі залатоўкі, яна лёгка кідае „Стшэльцы» або іншае «пшыспособене» і яшчэ лягчэй ідзе ў цёмныя падпольлі, дзе так-жа за залатовачку робіць найагіднейшую работу па ўказу „дабрадзеяў,“ каб у краю было найбольш няшчасьця і сьлёз. Пабыўшы ў падпольлі, калі там перастануць за „выступы“ плаціць, моладзь гэта варочваецца ўзноў у розныя польскія „кулкі“, усялякія „пшыспособені“ і ў „Стшэльцы“ і тады, прайшоўшы школу хітрасьці, такія малайцы ўмеюць вонкава сябе паказаць дзе трэба, каб штось згары капнула ў кішэнь, або дзесь прыстроіцца на пасаду ці работу. Калі-ж і гэткай дарогай не натрапляе на „шчасьце,“ ідзе на ўсё, а там спатыкаецца, як цяпер, з „даразным“ судом і кар'ера канчаецца вельмі сумна.

Вось абраз жыцьцёва-„ўзгадаваўчай“школы многай нашай беларускай моладзі там, дзе не зарганізавала яе свая беларуская арганізацыя і ня ўліла ў маладую пылкую душу нэктару духовага жыцьця — вышэйшай ідэі.

Старэйшыя людзі прыціснуты жыцьцёвым цяжарам, які так моцна прыдушыў у апошнія гады, глядзяць на гэтую моладзь безнадзейна, бо ня бачаць нідзе ні-адкуль для яе ратунку.

Вось менш-больш абраз цэласьці жыцьця як матэрыяльнага,так і духовага беларускага сялянства ў Наваградчыне.“

Гэтак піша нам наш дапішчык ***Шпак.*** Ад сябе мусім дадаць наступнае.

Найгоршы ў жыцьці стан, калі згубіцца надзея. Але Беларускі народ, агулам бяручы, надзеі ў лепшае заўтра ня згубіў. Аб гэтым сьведчыць жыцьцёвасьць беларускіх арганізацыяў, якія хоць і з вялікімі труднасьцямі, але ідэю будучыні ў народзе пашыраюць, вартасьць якіх у народзе аценяе і паважаны

наш карэспандэнт. Апрача гэтага нямала ў нашым народзе ёсьць ужо адзінак,якія ахвярна йдуць у бой з цемрай і змагаюцца з крыўляньнем беларускай народнай душы. Гэтыя сьведамыя і веруючыя ў лепшую будучыню Беларускага народу адзінкі, злучыўшыся ў беларускія арганізацыі культурна-прасьветныя, гаспадарча-эканамічныя і палітычныя, адкрыта дабіваюцца належных правоў Беларускаму народу, змагаючыся з цемрай, трэбуючы асьветы ў роднай мове, унармаваньня рэлігійнага жыцьця і справядлівага жыцьця соцыяльнальнага. Аб гэтым сьведчаць многія карэспандэнцыі з сяла, друкаваныя ў нашай газэце і справаздачы ды інфармацыі аб дзейнасьці беларускіх арганізацыяў.

Рэч ясная, што сучасная дзейнасьць беларускіх арганізацыяў не ахоплівае вялікай і шырокай тэрыторыі этнографічнай часткі Зах. Беларусі, але гэта ня віна беларускіх арганізацыяў.

Дзеля гэтага трэба, каб у сучасны мамэнт кожны сьведамы і добрай волі беларус стаўся місіянэрам беларускай народнай ідэі, якая абымае цэласьць жыцьця народу, і ахвярна ўсьведамляў навокал сябе, асабліва моладзь, зварочваючы яе пылкую душу да працы, да шчасьця, да зор.

Я. П

## „Z igły — widły“.

*(З літоўскага жыцьця.)*

Пад гэткім загалоўкам «Przegląd Wil.» з дня 30.X сёл. г. называе цэлы рад судоў і судовых спраў, якія перанесьлі віленскія літоўцы ад польскіх ўладаў за няпоўныя два апошнія месяцы. З «Przegl. Wil.» даведваемся аб гэтым наступнае.

8.IX суд у Сьвянцянах разглядаў справу трох сялян Юргеленасаў з Твэрэна, абвінавачаных за сьпеў «антыпаньствовых» песьняў. Суд пакульшто адложаны.

15.IX Гарадзкі Суд у Вільні разглядаў справу адказнага рэдактара «Viln. Rytojus» Ю. Новіка, абвінавачанага за артыкул, у якім ён памясьціў быццам непраўдзівыя весткі аб школах у Віленшчыне.

16.IX Акружны Суд у Вільні разглядаў справу трох літоўскіх сялян з в. Гірайці, Віл.-Троцк. пав., абвінавачаных за падпаленьне польскай школы. Абвінавачаных суд апраўдаў.

19.IX сэсія Віл. Акр. Суду разглядала ў Лідзе справу дзьвёх літвінак з в. Невашы, абвінавачаных з 129 арт. К. К. Асуджаны на 6 месяцаў турмы.

28.IX той-жа суд у Лідзе судзіў двух сялян літоўцаў з в. Дубіні, абвінавачаных за «антыпаньствовую» агітацыю: за намаўляньне не плаціць падаткаў, не пасылаць дзяцей у польскую школу і ўрэшце за тварэньне тайнай арганізацыі, маючай на мэце зьліквідаваньне польскіх уладаў. Абодвух суд апраўдаў.

30.IX Віл. Гарадзкі Староста сканфіскаваў № 19 газэты «Viln. Žodis» за артыкул аб школьніцтве.

6.X Віл. Суд Апэляцыйны разглядаў справу 7 літвінак і аднаго літвіна, абвінавачаных за забурэньне ў касьцеле ў в. Васюны, выступаючых у абароне там літоўскай мовы. Суд дзьве асобы апраўдаў, а рэшце прысудзіў тыдзень арышту. Прысуд Акр. Суду быў значна суравейшы і асудзіўшы быў усіх.

Таго-ж самага 6.X Суд. Апэл. разглядаў справу студэнта Фр. Жыжмараса, абвінавачанага за падбураючыя песьні. Жыжмарас у першай інстанцыі асуджаны на 3 мес. турмы з стрыманьнем кары на тры гады. Суд Апэл. справу гэту пераслаў узноў Суду Акр. дзеля перагляду.

8 X Віл. Апэл. Суд разглядаў справу трох сялян і сялянак з в. Круміні (гм. Алькеніцкая), абвінавачаных за арганізаваньне тайных сходаў і за «антыпаньствовую» агітацыю. Староста асудзіў іх па 500 зл. кары кожнага, Акр. Суд апраўдаў.

19.X Віл. Апэл. Суд разглядаў справу вучыцелькі з Гервят, абвінавачанай за нелегальны сход і старастам за гэта пакаранай на 200 зл. Суд вучыцельку апраўдаў.

Вялізарную большасьць абвінавачаных, як бачым, суд апраўдаў, бо абвінавачаньні гэныя былі мусіць пераважна апёртыя на фантазыйных даносах паліцыі яўнай і тайнай, якая сапраўды можа зрабіць з іголкі вілы.

На заканчэньне ад сябе можам літоўцаў толькі пацешыць, што ўсё гэта і нам беларусам аж за добра ведама, што ўсё гэта дзеецца і з намі і што мы зьяўляемся сапраўды «друзья по нещастью»...

М. К.

## З беларускага жыцьця.

**У 50-тыя ўгодкі беларускіх паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа** Віленскае беларускае грамадзянства ў 50-ыя ўгодкі ладзіць урачыстую акадэмію дня 27 лістапада сёл. году.

**„Студэнская Трыбуна.“** Група беларускіх студэнтаў Віленскага унівэрсытэту з пачатку г. м. прыступіла да друкаваньня ў „Бел. Крыніцы“ аддзелу аб студэнскім жыцьці пад загалоўкам „Студэнская Трыбуна.“ Гэты аддзел «Студ. Трыбуна“ мае паяўляцца на бачынах нашай газэты раз у месяц.

**„Сьвята Ашчаднасьці“.** З нагоды дня «Сьвята ашчаднасьці,“ якое прыпадала на дзень 31 м. м., рэдактар — выдавец беларускай коопэратыўна-гаспадарчай часопісі „Самапомач“ — інж. А. Клімовіч, у памешканьні Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры, наладзіў публічную лекцыю на тэму „Ашчаднасьць як аснова народнага быту.“ Пасьля лекцыі адбылася даволі жывая на гэту-ж тэму дыскусія, якая між іншым усталіла, што:

1. ашчаднасьць ёсьць адзіным спосабам падняцьця нашага гаспадарчага жыцьця;
2. ашчаднасьць у нашы цяжкія нават часы ўсё-ж магчымая, доказам чаго служаць уклады у прыватныя і дзяржаўна-польскія банкі, з якіх яны найчасьцей на вёску ўжо не варочваюцца;
3. патрэбна ашчаднасьць ня толькі грошай, але часу, здароўя і працы;
4. ашчаднасьць ня ёсьць збыткам, але гаспадарчай канешнасьцю;
5. „грош ня той што ляжыць, але той, што бяжыць, той дае жыць.“

**Лекцыя ў Т-ве Прыяцеляў Беларусаведы.** У нядзелю 13 лістапада с. г. адбудзецца першая ў гэтым годзе навуковая зборка ў Таварыстве, падчас каторай старшыня Т-ва гр. Станіслаў Станкевіч прачытае лекцыю на тэму: „*Аб беларускай літэратурнай сучаснасьці ў Заходняй Беларусі.*“ Пасьля лекцыі—дыскусыі. Зборка адбудзецца ў салі VII Унівэрсытэту (уваход з панадворку касьцёла сьв. Яна). Пачатак а гадз. 17-ай. Уваход вольны.

**На Каталіцкія Задушкі** (2.XI) ў Вільні на магілках „Роса“, над ілюмінаванымі магілкамі беларускіх паэтаў Каз. Сваяка і Ядвігіна Ш. сабралася даволі многа маясцовага беларускага грамадзянства, пераважна моладзі, дэманструючы духовую лучнасьць з памёршымі паэтамі.

**„Нёман“.** Рэдакцыя беларускага літэратурна-навуковага месячніка „Нёман“ паведамляе, што часопісь пасьля летняга перарыву пачне выходзіць нормальна. Кніжка пятая часопісі выйдзе ўжо ў гэтым месяцы. Адрэс Рэдакцыі „Нёман“ —Вільня, вул. Партовая № 28—10.

**„Шлях Моладзі“** № 10 (45), кастрычнік 1932 г., гэтымі днямі выйшаў з друку. Адрэс рэдакцыі: — Вільня, Завальная 6—10.

### БЕЛАРУСЫ Ў ЛАТВІІ.

**Юбілей Я. Купалы і Я. Коласа.** Рыская беларуская прыватная гімназія Т-ва беларускіх вучыцялёў у Латвіі дня 29 кастрычніка с. г. ладзіла ўрачысты абход 50-цігодзьдзя беларускіх паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

**W. A.**

### MIKAŁAJ „PRACAWITY.„

Łukonica wioska—
Ad kaścioła kroška,
Adbiłaś zboku,
Staić nieŭdaloku.

Ludzi tut — jak treba,
Nia żywuć biaz chleba;
Tolki ŭ Mikałaja
Chleba nie chwataje.

Ci jamu nia rodzić?—
Moža wiedźmy škodziać?
Abo chto urokam
Krywym kinuŭ wokam?

U kirmaš, ci ŭ świata—
Rannyja raraty
Mikałaj spraŭlaje —
Ŭ Dowida hulaje.

Kožnuju niadzielu
Nia bywaŭ ŭ kaściele:
U miastečka chodzić,
Z saboj bandu wodzić.

Z Dowidam witaliś,
Čuć nie caławaliś;
A jon druh charošy,—
Aby tolki hrošy!

„Och! jšli my šparka —
Wypjem, bracie, čarku!
Žyćcio naša horka.
Sieladca daj, Sorka!“

„Ciažka żyć mnie, bracie:
Kryčać dzieci ŭ chacie,
Żonka wiečna złuje...
Naliwaj druhuju!“

—„Babskich ślozaŭ chwacie...
Pluń na ŭsio, moj bracie!
U ručki wašeci!
Wypjem čarku trećciu“.

„Uch! jak wam nia stydna?
Kab ja żyŭ, abidna —
Żonki wam bajacca“,—
Dowid staŭ śmiajacca.

Dowidu wiadziecca:
Jon usio śmiajecca,
Bo z im niama žartaŭ: —
Jak machlar toj z kartaŭ,

Tak jon z hetych čarak
Załatowak, marak
Naskładaŭ ŭ kamodu
Z biednaha narodu.

Śpiarša redka pili,
Poraŭnu dzialili;
Pośle huściej stali,
Pokul pierastali.

Mikałaj ŭzdychaje,
Janka pamahaje;
Pośle — wiesialicca,
To znoŭ stali bicca.

Nie dapiŭšy čarku,
Druh druhu pa karku,
Ŭ hoławu i ŭ plečy —
Biaz nijakaj rečy.

Dowid tut z Abramam,
Sorka z całym kramam
Stali ich ciahaci
Pa toj całaj chacie.

Pośle toj abławy
Palahli pad ławaj—
Janka z Mikałajem
Starym abyčajem.

Miesiac świecić jasny,
Mikałaj niaščasny
Brodzić kala lesu,
Choć biaz intaresu;

Z druham ciapier nowym,
Z kustom jełaŭcowym,
Staŭ jon abymacca,
Luba caławacca:

—„Ty, jak chočaš, łajsia,
Ale nia ščypajsia!“—
Staŭ taptać nahami
Bicca kułakami.

Adkul što biarecca,
Mikałaj pry rečca,
Jak zapluščyŭ wočy,
Siadzieŭ da paŭnočy.

Inšy dwa kumpany
Byli dobra pjany,
I Jakub Łupaty,
Što z susiedniaj chaty.

Ŭ rowie adpačyli,
Bułkaj zakusili,
Rybkaj u blašanca,
Wypili pa šklanca.

Jak pryjšlo ŭstawaci —
„Ŭ boku kole, bracie!“ —
„I mnie kole tak-ža!“—
„Oj, i mnie, a jak-ža!“

Stali tut kačacca,
Dyj za ruki bracca,
Ale-ž, bracie miły,
Nie chwataje siły!

Woś haścincam-šlacham
Paŭzuć, biedny, rakam;
I Jakub Łupaty,
Jak toj čort rahaty;

Janka z durna-pjana
Prachadziŭ da rana;
Spaŭ pry chlewie nowym
Z parsiukom młynowym.

—o—

Kaho hora mučyć,
Čaračka nawučyć,
Wolaj ci niawolaj,
Jak zmahacca z dolaj.

Choć i horka wodka,
Choć žyćcio karotka,
Choć i ludzi bačać,
Choć i dzieci płačuć,

Pij, brat, zaliwajsia!
Horu nie dawajsia.
Dawid-druh charošy,
Aby tolki hrošy!

## З заграніцы.

**Электроўню пабудавалі, а земляробства зьнішчылі.** Бальшавікі, перабудоўваючы Расею на „новы" камуністычны лад, маюць нямала клопату з недарэчнасьцямі ў поўнай колектывізацыі гаспадаркі. Прыбраўшы да рук промысел, зьвярнулі ўсю энэргію на будову фабрык і электрыфікацыю. Натужыўшы сілы ўсяе Расеі ўдалося камуністам збудаваць даволі вялікую электроўню на Дняпры, якая мае сілу 800 тысяч конскіх сіл і дае электрычную энэргію кругом на 75 вёрст. Але ў земляробстве, якое камуністы так-жа прыбралі да рук, забраўшы зямлю ў колектыўны гаспадарк, сусім кепска выходзіць. Паводле плянаў камуністычнай гаспадаркі трэба было сёлета засеяць азімінай 35,6 мільёнаў гбктараў поля, а тымчасам засеялі толькі 19 мэльёнаў гэктараў. А гэты недасеў аказўся ў найбольш ураджайнай краіне — на Украіне. Такім чынам над Дняпром можа быць сьветло і энэргіі электрычнай для тамашняга промыслу можа хопіць, але чакаючы другога ўраджаю трэба ўжо зацісказь жывот у дзягу, бо калі не пасееў, дык няма надзеі і на жніво.

**Рэлігійны прасьлед.** У апошнія часы ў Мэксыцы пачаўся нанова паход ураду проціў рэлігіі. Урад забараніў веруючым публічна маліцца Богу, а духаўнікоў за публічнае набажэнства перадае ў суд, які за гэты „праступак" садзіць духавенства ў вастрогі.

У Гішпаніі ўзноў пачалі паліць касьцёлы. Надоўвячы спалены ў м. Маркена аж 2 сьвятыні. Газэты падаюць, што падпаліваньнем касьцёлаў займаецца нейкая бязбожніцкая арганізацыя, якая разьяжджае па Гішпаніі і падпалівае касьцёлы. Улада, як відаць, або ня хоча перашкаджаць гэтаму злачынству, або бязсільная прад злачынцамі.

## З Польшчы.

**Сойм і Сэнат.** Звычайная бюджэтная сэсія польскага парляманту ўжо пачалася. Прэзыдэнт адчыніў гэту сэсію дэкрэтам ад 1 лістапада, а маршалак Сойму склікаў паслоў на паседжаньне на 3 лістапада.

**Далейшая ліквідацыя „Обозу Вельке Польскі".** Пасьля ліквідацыі адміністрацыйнай уладай эндэцкай арганізацыі „Обоз Вельке Польскі" на Памар'і і ў Пазнаншчыне, гэтымі днямі адміністрацыйныя ўлады закрылі гэту арганізацыю і ў Келецкім ваяводзтве і ўсё за тое, што быццам гэта арганізацыя гразіць нялдам грамадзкай бязпечнасьці.

**Амнэстыя.** Апошнімі днямі м. м. прэзыдэнт Польшчы выдаў дэкрэт аб амнэстыі, якая абымае некаторыя праступствы за якія віноўныя засуджаны да 6 месяцаў вастрогу.

**Капіталістычная бязглуздзіца.** Газэты падаюць, што дзяржавы картэль (Саюз Продуцэнтаў Дрожджэй) плаціць вялікія сумы грашэй тым фабрыкам дражджэй, якія спынілі сваю дзейнасьць. І так, Зах.-Польскае Спіртовае Т-ва, за тое, што перастала вырабляць дрожджы, атрымала 1 мільён 675 тысяч зл., а фабрыка Геца дастае па 600 тысяч зл. ў год. Гэтак „зарабляюць" і іншыя фабрыкі, якія рабілі дрожджы, а цяпер пе расталі.

**Дэманстрацыі студэнтаў.** Апошнімі часамі польскае студэнства заварушылася і пачало дамагацца зьніжкі платы за навуку ў унівэрсытэце. У Варшаве студэнты наладзілі дэманстрацыйны паход па вуліцах.

**Адстаўка мін. Залескага.** У сераду 2 г. м. пайшоў у адстаўку міністр заграгічных спраў А. Залескі. Ягоным наступнікам стаўся палкоўнік Яз. Бэкк.

## Дробныя гаспадарчыя весткі.

— Польскі ўрад выдаў распараджэньне, паводле якога задоўжаныя двары маюць права парцэляваца (прадаваць землю) без дазволу зямельных камісараў. Скарбовыя ўлады маюць наказ не рабіць перашкод запісваць на ўласнасьць пакупшчыкам задоўжаныя падаткамі зямлі.

— Нядаўна польскі ўрад выдаў распараджаньне, што ад дня 21 кастрычніка с. г. ніхто ня мае права браць больш як 12 гадавых процантаў ад пазычаных грашэй. Нават калі хто пазычыць на сплату таварамі або на адработак, то таксама ня мае права лічыць большага проценту. Больш процант уважаецца за ліхву і будзе сурова караны.

— Польскае Мін. Скарбу дня 30.IX с. г. выдала распараджэняне, якое разьясьняе, каму можна даравадь сплату выданай запамогі як пацэрпеўшым ад вайны.

Гэнае распараджэньне выясьняе, што сплата запамогі, выданай пацэрпеўшым ад вайны, будзе даравана тым, хто ня можа сплаціць гэтага доўгу з прычыны абяднення, калі гэная запамога не пайшла ў гаспадарку на карысьць з прычын ад гаспадара незалежных, або атрыманая запамога не надавалася на будоўлю, калі запамога была выдана дзеравам.

Аб скасаваньні сплаты гэтай запамогі трэба падаваць просьбу ў паветавае староства.

— Да гэтай пары Англія купляла дзерава ад бальшавікоў з С. С. Р. Р., дзе камуністычная ўлада рубала лес пры помачы сялян-высяленцаў з родных краёў. Цяпер Англія сарвала дагавор з бальшавікамі і будзе купляць дзерава з Швэцыі і Нарвэгіі.

— Між Англіяй і Скандынаўскімі дзяржавамі (Данія, Швэцыя і Норвэгія) вядуцца перагаворы ў справе гандлю сьвіньмі і маслам. Англія мае даць пяршынство гэтым дзяржавам прадаваць на англійскіх рынках сьвіней і масла, а сканд. дзяржавы маюць купляць з Англіі вуголь.—Калі гэтыя перагаворы дойдуць да скутку, дык гэта моцна адаб'ецца на польскім сялянстве і польскіх капальнях вугля. Бо дагэтуль $^2/_3$ збыту з Польшчы сьвіней ідзе ў Англію, а Данія, Швэцыя і Нарвэгія былі галоўнымі купцамі польскага вугля.

*Мала прачытаць газэту самому: трэба яе прачытаць сабраным суседзям разам*

## Да нас пішуць.

ЛЯХАВІЧЫ, БАРАНАВІЦКАГА ПАВ.

Прошлы раз я пісаў аб нацыянальным, культурным і эканамічным жыцьці Ляхавіч а цяпер напішу аб рэлігійным і ўсялякім іншым.

Калі будзем гаварыць аб рэлігійным жыцьці, то трэба сказаць праўду, што Ляхавічы глыбака рэлігійнае мястэчка. Хрысьціянская часьць Ляхавіч — гэта бадай усе каталікі, праваслаўных у мястэчку зусім мала. На вёсцы—наадварот: каталікоў мала, а большасьць праваслаўных. На жаль, праваслаўных і каталікоў тамака разьядзе рознае сэктанства, як штунда, баптызм, мэтадызм і інш. У такіх напр. Рачканах запанавала штунда, якая цягне да сябе і праваслаўных і каталікоў.

Духавенства ў Ляхавічах такое: каталіцкі дзекан, прэфэкт і праваслаўны бацюшка. Дзекан адносна беларусаў дзяржыцца нэўтральна, і хоць сам эндэцкіх пагляддаў, аднак дзейна выступаць ня хоча, а можа і баіцца беларускіх сьведамых масаў. Што датыча прэфэкта, то гэты хоць зусім нявыразны тып у іншых адносінах, адносна беларусаў зусім выразны: ён усюды варожа выступае проціў нас, а нават у школе з дзяцьмі, якія запісаліся беларусамі, вядзе дыскусі, даказваючы ім, што ніякіх беларусаў няма, ня было і ня будзе. Дзеці пратэстуюць проціў вывадаў свайго няўдалага пэдагога, даказваючы, што беларусы ёсьць і іх далёка ня трэба шукаць і што нават польскія школьныя падручнікі беларусаў прызнаюць. Ня трэба хіба і гаварыць, што ўжо само заводжаньне такой дыскусіі з дзяцьмі вельмі добра сьведчыць аб пэдагагічным і інтэлектуальным узроўні ксяндза-прэфэкта.

А што-ж сказаць аб праваслаўным бацюшцы? Гэты сядзіць ціха і спакойна, як гэта кажуць: „ня нашым і ня вашым", а скарэй і нашым і вашым, бо з аднаго боку і „Святую Русь" успомніць і з другога — стараецца, каб і „Ojczyznę Polskę" не загневіць; але каб для свайго народу, з каторага ён жыве, штосьці рабіў, то аб гэтым нічога ня чуваць.

Каб даць поўны абраз Ляхавіцкага жыцьця, трэба яшчэ ўспомніць аб адносінах польскага грамадзянства да беларусаў, а гэтыя адносіны вельмі характэрныя. Калі беларус ёсьць нясьведамы, ён не зварочвае на сябе ніякай увагі з боку польскіх кругоў; і калі ён прызнае сябе за паляка — вельмі добра; калі за расейца — трохі горш, але яшчэ паўбяды; а найгорш, калі прызнае сябе за беларуса — тагды цэлая бяда. Тагды йдуць розныя падазрэньні: а хто ён такі, а што ён рабіў перад гэтым, а куды ён імкнецца, а з кім ён мае знаёмства і гэтак далей. У канцы кожнага сьведамага беларуса робяць камуністым, хоць гэты „камуніст" і да касьцёла або царквы ходзіць, і пашырае беларускія незалежніцкія ідэалы і працуе на народнай ніве і не належыць да ніякай камуністычнай акцыі. Ён у праканаваньні польскіх кругоў усё-адно: камуніст. Даводзілася мне спатыкаць адзінкі ў польскім грамадзянстве, якія з цэлай сьведамасьцяй гаварылі, што кожны сьведамы беларус, асабліва праваслаўны,—гэта камуніст. Трудна згадаць, колькі ў гэтым сьцверджаньні было шчырасьці, а колькі палітычнага фальшу, прыкрываючага сапраўдныя прычыны іх варожасьці да беларусаў. Магчыма, што гэтае апошняе і было выражэньнем тэй праўды, якая крыецца ў ведамай прыказцы: хто хоча ўдзярыць, той заўсёды кій знойдзе. Вось гэтае варожае і несправядлівае адношаньне да беларусаў з боку польскага грамадзянства і ёсьць аднэй з галоўных балячак Ляхавіцкага грамадзкага жыцьця. А другой балячкай будуць... суслы.

Спытае можа хто, адкуль узяліся ў Ляхавічах суслы? Прывёз іх быццам некалі для свайго зьвярынца ў Нясьвіжы князь Радзівіл яшчэ тагды, калі нясьвіскія князі трасьлі ўсім гэтым краем. З часам Радзівіллы падупалі, зьвярынец зьліквідавалі, а суслы асталіся і разышліся па ўсёй Случчыне. Дзеля таго, што суслы любяць жыць па сухіх і ўраджайных палёх, а Ляхавічы ляжаць на граніцы ўраджайнай Случчыны, суслы аблюбавалі ляхавіцкія палеткі, пакапалі для сябе норы і робяць тамашнім земляробам вялікія шкоды. У сваё гняздо сусел на зіму патрапіць нанасіць пару пудоў збожжа. Людзі старающца іх нішчыць саматугам: льюць ваду ў норы, падкурваючы іх, але такія саматужныя спосабы не прыводзяць да больших рэзультатаў. Калі-б нават ляхавічане і патрапілі іх выдушыць, то найдуць з другіх ваколіц. Тут патрэбная была-б дзяржаўная помач і арганізацыя. Пры добра зарганізаванай дзяржаўнай помачы можна было-б вытруціць іх даволі лёгка, ёсьць-жа цяпер розныя газы і іншая атрута, але нажаль, помачы з боку дзяржавы няма.

Слухаючы расказу мясцовых жыхароў аб суслах, мне прыпомнілася байка нямецкага пісьменьніка Лессінга. У гэтай байцы сусел зварочваецца да мурашак і кажа ім: «Якія вы няўдалыя, мурашкі! Гэтулькі вас ёсьць і працуеце вы ад рана да вечара, а чым-жа вы можаце пахваліцца? Гэтай кучай усялякага лахмацьця! Глядзеце вун на мой запас, ён не раўня вашаму»! А мурашкі яму ў адказ: «Так, так, але мусіць за тое цябе людзі і б'юць, што ты назьбіраў болей, чым табе трэба, дый яшчэ з чужою крыўдаю»...

Гэтая байка ў сяньняшніх часох гаворыць вельмі многа.

Падарожны.

## З краю.

**Трагэдыя з прычыны недагляду дзяцей.** У в. Зубоны Вялейскага пав. надоўвячы дзяцей пакінутыя без дагляду падпалілі сушню з лёнам і ў гэтай сушні Уладзімір Броўка, 6-ці гадовы хлапчук, згарэў сам, а яго 7-мі гадовая сястра Люба абгарэла да паўсьмерці.

**Звычайная байка ці напад.** Гэтымі днямі М. Ярмаковіч абабіў уласьніка фальварку Слабодка, Вялейскага пав. Паліцыя вядзе сьледзтва, ці ня было тут нападу, бо абабіты заявіў, што прапала ў яго шапка і 20 зл., якія былі ў шапцы. Калі гэта быў напад, дык Ярмаковіч будзе адказваць прад дарадным судом.

**Высьцерагайцеся гранатаў.** На палях нашага краю шмат яшчэ валяецца астаўшыхся ад вайны гранатаў. Людзі, знаходзячы гэны сьмяротны ком жалеза, пачынаюць яго варочаць, у выніку чаго бываюць калецтвы і сьмерць. Надоўвячы гэткі выпадак здарыўся ў Віл.-Троцкім пав., дзе стары гранат разарваўшыся скалечыў С. Здановіча і яго суседку Сладневічанку.

# Nr. 1. STUDENSKAJA TRYBUNA. 6.XI.1932.

* * *

Biełaruskaje studenstva vilenskaha i niavilenskaha ŭniversytetu, dziela pryčyn ekanamična-materyjalnaha charaktaru, pazbaŭlena mahčymaści vydavać svaje stałyja perjodyčnyja časopisi, druki i inšyja formy prajaŭleńnia svajej dumki. I heta spryčyniajecca ŭ peŭnaj miery da zastoju ŭ žyćci biełaruskaha studenstva, da spynieńnia jaho naležnaha raźvićcia. Niastača drukavanaha słova, hetaha mahutnaha faktaru ŭ žyćci kožnaha kulturnaha narodu ahułam, a dla biełaruskaha studenstva ŭ paru adradžeńnia jahonaha narodu ŭ asobnaści, jość źjaviščam vielmi sumnym, amal trahičnym. Hety trahizm stanovicca bolšym i balučejšym tady, kali siarod studentaŭ znachodzim adzinak z pałkim, haračym sercam, ludziej tałanavitych, „z iskraj božaj“, — zdolnych adčuvać, pieražyvać i žyć dla roznajakich prajavaŭ hramadzkaha, kulturnaha i inšaha vidu žyćcia, a dla jakich słuženńie hetamu žyćciu jość patrebaj kanieśnaj, prosta arhaničnaj.

Kažuć — *egestas artes docet* — ubohaść rodzić (vuča) štuki. Chaj hetym razam dla biełaruskaha studenstva jahonaja ŭbohaść, kali nie daje mahčymaściaŭ vydavać svaich asobnych, stałych časopisiaŭ, svajho asobnaha drukavanaha słova, zrodzić i navuča štuki vykarystać inšyja mahčymaści prajaŭleńnia svajej dumki.

* * *

Hrupa biełaruskaha studenstva vilenskaha ŭniversytetu, razumiejučy ŭsio vyšejskazanaje, źviarnułasia da Redakcyi „Biel. Krynicy“ z prośbaj dazvolić jej na špaltach hetaje časopisi źmiaščać *drukavanaje biełaruskaje studenskaje słova*,— pryśviačajučy dziela hetaj mety, u celaści ci ŭ častcy, zaležna ad pryhatavanaha da druku studenskaha materjału, adnu z staronak „B. Krynicy“ — *raz a to i čaściej u miesiac*, — a hetym samym dać mahčymaść prajaŭleńniu studenskaj dumki.

Studenskuju prośbu Redakcyja „B. Krynicy“ całkom zrazumieła i vyrašyła pazytyŭna. Ščyraja Jej za heta padziaka!

Dyk majem my, henaja hrupa studentaŭ, mahčymaść raspačać pracu i redahujem užo pieršy numar svajho *sui generis* orhanu. Nazyvajem jaho *„Studenskaj Trybunaj“*, u jakoj biełaruskija studenty, hdzie-b jany nie studyjavali, — u krai ci zahranicaj, — buduć mieć mahčymaść vyskazacca i drukavać svaje artykuły i infarmacyi, majučyja značeńnie ahulnahramadzkaje biełaruskaje i studenskaje, adnak-ža z *zaściarohaj*, što hetyja apošnija — artykuły i infarmacyi — kali-b mieli charaktar palityčny, — *nie adchilalisia-b u padstavovaj svajej dumcy ad idei* aktu z 25.III.18 h,*) i vytknutaha im šlachu Pahoni pad bieł-čyrvona-biełym ściaham. Značyć, platforma „Studenskaj Trybuny“ u sensie palityčnym, jaje palityčnaje *credo*, idzie pa linii niezaležnickaj i demokratyčnaj, z orjentacyjaj na narod biełaruski, na jaho śviadomaść i siłu. U vyniku hetaha, jasna, biełaruskija studenskija i niastudenskija hrupy i arhanizacyi, jakija reprezentujuć inšyja kirunki i orjentacyi, — znajduć u nas svaich idejovych praciŭnikaŭ i antahanistaŭ i buduć nami zmahanyja.

Hetak pradstaŭlajecca sprava palityčnaha „tvaru“ „Studenskaje Trybuny“. Dzieła vyśviatleńnia hetaha palityčnaha tvaru, kali-b kamu jon byŭ niajasny i kali budzie patreba, i dziela vyjaŭleńnia svajho pierakanańnia, što naš palityčny ideał nia jość vynikam niejkaha palityčnaha romantyzmu ci niejkaha palityčnaha fantaziorstva, ale ideałam, jaki ŭ niedalokaj budučyni moža stacca realnaściu, — jašče chiba-ž niaraz zabiarom hołas.

My siańnia vierym u hety ideał i vieru svaju apiorli na vynikach sučasnych palityčnych navuk, demokratyčnych kirunkach i koncepcyjach — i ich konkretnaj realizacyi.

Ahułam biaručy, mament palityčny ŭ

*) Hetaha dnia Rada Respubliki vybranaja na Ŭsiebiełaruskim Kanhresie z śniežnia 1917 hodu ŭ Miensku abvieściła Biełaruś Volnaj i Niezaležnaj Dziaržavaj, na asnovach demokratyzmu.

## Naša słabaść i siła.

*(Artykuł dyskusyjny).*

Mnoha pryśviečana słoŭ u biełaruskaj presie roznym ahulnym pytańniam z haliny palityčnaj, hramadzkaj, relihijnaj i inšych, a mała źvierniena ŭvahi na ŭzhadavańnie paasobnaj adzinki—hramadzianina. I dziela hetaha vyniki možna bačyć nadta sumnyja.

Voś X i Y biełarusy, zdajecca bolš jak 100 pracantovyja, chapajucca za ŭsio, što biełaruskaje, pišuć prahramovyja staćci, „udarnickija“, buntarnyja vieršy, kryčać, šumiać, zdajecca hetyja ludzi žyćcio hatovy addać za Baćkaŭščynu. Prajšoŭ adnak hod, druhi, niechta ich kryšku skrytykavaŭ i jany zacichli, a na't vyrakajucca svajej narodnaści. Pačni havaryć z takim byŭšym „udarnikam“, dyk jon kaža: „Niachaj kožny zrobić, skolki ja, dyk chopić. Dy mnie ŭžo i da starejšych para pryłučycca“.

Hamaniŭ tak „udarnik“, kali jamu heta spraŭlała „pryjemnaść“, ci było patrebnym, a jak astyŭ zapał, dyk pačućcia abaviazku niamašaka. Pry hetym maje advahu chacieć zaličycca da starejšych, jakija pavodle jaho, mała jeść ničoha nie rabić!... Heta adzin rod „udarnikaŭ“.

Druhoha rodu „udarniki“ pačynajuć być nia tolki bolš 100 prac. biełarusami, ale i takimi-ž staronnikami jakohaś palityčnaha napramku. — Kryčać, šumiać, pišuć, až iznoŭ niejdzie spatyknucca: niasłušna ich asudziać, abo mo' i hroša nie daduć, tady jany sa zdolnaściaj cyrkoŭcaŭ pierakidyvajucca ŭ druhi palityčny łahier i pačynajuć buryć usio toje, što dahetul „budavali“; pry hetym zaznačajuć, što ŭ ich abo pahlady źmianilisia, abo što im kaža tak rabić razvaha, i časta paklikajucca na jakohaś starejšaha pierakidčyka. I ci-ž mała takich jość, što byli raniej niezaležnikami, paśla stali „tancavać“ pad huki III-ciaha internacyjanału. A kali na ich i tam paznalisia, „udaryli“ ŭ pałanafilstva supra 100 prac., a na čym skončać, dyk im samym na't niaviedama.

Treciaha rodu „udarniki“ — heta viečnyja ŭsiaho i ŭsich opozycyjanery, „krytyki“ i tvarycieli pratestaŭ, votum seperatum i t. d. Što jany majuć na dumcy, — niaviedama, ale tolki viedama, što ni z kim nie zhadžajucca, usio, što robiać inšyja, robiać, pavodle ich, nia tak, jak naležycca, „nia žyvuć u XX stahodździ,“ nia jduć za postupam dumki i t. d. i t. d. A sam taki opozycyjaner jeduĉy na viosku i knižački rodnaj nia voźmie!...

Usim pieraličanym typam „udarnikaŭ“ i „budaŭničym“ Biełarusi zdajecca, što tolki jany štoś robiać, tvorać i t. d. A paŝarod ich znachodziacca i piešniary, jakija kidajuć dziorskija klićy niaraz pad adresam starejšaha hramadzianstva, kab im, razumcam, darohu i miesta davała, a samo kab uvažała siabie za ničto i adyjšło.

Prypomniŭšy tut staruju prypovieść ab baćkoch, jakich dzieci razrezali na pałovu źniščanuju koŭdru i pryznačyli adnu pałavinu jaje dla maciary, a druhuju dla baćki, a jakoj henyja baćki nakryvali ŭ svaim časie svajho-ž baćku, — varta adciemić, što kab nie starejšaje hramadzianstva, dyk šmat chto z hetych „razumnych“ maładzionaŭ nia byŭ-by takim rachmanam, a časta mo' i „fachu karaleŭskaha“ pry stadzie pryšłosia-b jamu zaznać...

Pryniaŭšy pad uvahu vyšejskazanaje, treba zastanavicca, čamu naša akademickaja i nieakademickaja moładź u značnaj častcy tak adnabokaja i tak biezpryncypovaja? Adkaz jasny. Ludzi hetyja nia vyrabili ŭ svaim časie silnaj voli, stojkaści, planovaści, systematyčnaści, pracavitaści, pašanavańnia svajej hodnaści, naahuł nia vyrabili jany charaktaru i śvietapahladu.

(d. b.)

*J. M.*

„Stud. Tryb.“ *miejsca zajmie fakultatyŭnaje*

Tak robiačy, vychodzim z taho słušnaha, pa našamu, pryncypu, što „Stud. Tryb.“ *nie pavinna stacca abitacyjnaj palityčnaj literaturaj*, reprezentantkaj *tolki* palityčnaje dumki zhurtavanaha kala jaje studenstva. Jość šmat inšych, aproč palityčnaha, mamentaŭ i prablemaŭ biełaruskaha i ahulnaludzkaha, studenskaha i niastudenskaha žyćcia, — a pradusim mament hramadzkaha *ŭzhadavańnia*, — jakija nahvalt vymahajuć ahavorki i vyśviatleńnia.

Dyk my dać *naležycca pieršaje miejsca* i dla ich ahavorki i vyśviatleńnia zaklikajem usio dobraje voli biełaruskaje studenstva.

Hetyja mamenty i prablemy niachaj nas zmusiać da supracoŭnictva, niachaj nas łučać i znajduć adbićcio ŭ „Stud. Trybunie“,dla karyści svajej i svajho narodu!

*Redakcyja „ST. TR.“*

## Chronika.

Biełaruski Studenski Sajuz u Vilni, —z dasiulešniaha jaho pamieškańnia na Vostrabramskaj vul. 9 — pieraniośsia ŭ časovaje pamieškańnie, pry vul. Ludvisarskaj 1—19, dzie ŭ aŭtorki, čećviarhi i suboty ad 3 da 5 h. p. p. adbyvajucca dyžury siabroŭ Uradu B. S. S.

Biełaruski Chor pry B. S. S., zarhanizavany ŭ min. akad. hodzie dziakujučy achviarnaj pracy hr. R. Šyrmy, raspačaŭ i viadzie śpieŭki.

Usich, kaho Apollo abdaryŭ kachańniem charastva i harmonii, chto choča sam vyvučyć čaroŭnyja biełaruskija pieśni i pryčynicca da rostu važnaje nacyjanalnaje instytucyi, — Chor horača zaklikaje na svaje śpieŭki, jakija adbyvajucca ŭ umoŭnym časie i miejscy.

Asabistaje. Z nahody žanićby kal.kal. T. Kunickaha i S. Saroki, Red. „St. Tr.“ žadaje Im ščaślivaha siamiejnaha žyćcia i ŭzhadavańnia baraćbitoŭ za volu našaha Narodu.

Studenskaje vieča na U. S. B., ŭ spravie padvyžki ŭ siol. akad. hodzie akad. apłataŭ (na 100 prac. adnosna staroj normy; ciapierašniaja padvyššanaja apłata naličaje 300 zł. i abaviazuje ŭ hetym hodzie studentaŭ I-šaha kursu, u nastupnym hodzie II-ha kursu i h. d.) adbyłosia dn. 26 m. m.

Z krytyčnaje i račovaje ahavorki na viečy hetaj spravy stude nstva pierakanałasia, što padvyška apłataŭ—heta krok Ministra Aśviety dziela ahraničeńnia nadpradukcyi intelihiencyi z vyššaj aśvietaj, heta vyjaŭleńnie egoizmu i strachu starejšaha hramadzianstva, jakomu klasa praletaraŭ z vyžšaj aśvietaj pahražaje adabrańniem varštatu pracy; — heta ŭdar pa słabych ekanamična słajoch hramadzianstva — asabliva-ž pa sialanstvie i drobnym miaščanstvie,—jakim dźviery da ŭniversytetaŭ padvyška apłataŭ začyniaje, i jak takaja jość źjaviščam antyhramadzkim.

Kali voźmiem pad uvahu, što biełaruskaja moładź naleža da hramadzkaści najbolš pakryŭdžanaj ekanamična, socyjalna i nacyjanalna, zrazumiejem, što padvyšeńnie apłataŭ vielmi baluča adabjecca na hetaj-ža bieł. moładzi.

Vieča skončyłasia pryniaćciem rezalucyi, u jakoj pamiž inšym skazana: „prosim źnižyć apłaty da staroje normy,... bo što 3-ci dzień adzin z nas umiraje na suchoty“.

„Carpe diem!“ Kažuć, byccam dźviery Kanventu „Scorinia“ na Bakšcie traščać ad naporu novych kandydataŭ na fuksaŭ. Atrakcyjnaja „siła“ skoryninskaha „pozytyvizmu“ — niačuvanaja,... bo navat hr. Ch. zachvalavaŭsia ŭ svaich padstavach i staŭsia fuksam „Scorinii“.

B. S. S. astajecca tolki ciešyucca, što karparacyja adyhraje rolu „mahnesu“, jaki B.S.S. rady ačyścić ad niepatrebnych apiłak.

Vyšejskazanaje moža być i jość adnym z mamentaŭ našaha adkazu polskim ludoŭcam-studentam U.S.B., na ich pytańnie i ździŭleńnie, čamu miž bieł. studenstvam paŭstała hetaja karparacyja.

Redakcyjnaja Kalehija „Studenskaj Trybuny“ —u składzie kal. kal.: M. Tatarynovičanka, J.Šutovič i J. Malecki

*Sekretarjat „Stud. Trybuny“ čynny kožnuju niadzielu miž 11—12 hadz. pry vul. Ludvisarskaj 1—19.*

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.